ХОР ПА-РАНЕЙШАМУ СПЯВАЕ

У мяне са слыхам глуха: наступіў мядзведзь на вуха.

Спачатку — на адно, потым — на другое. Таму за мелодыю я паручыцца не магу, хіба за словы.

А вось спяваць любіў і люблю. Праз гэта некалі ў харавы калектыў запісаўся. Праўда, паслухаўшы мяне, яго кіраўнік прамовіў: так і так, маўляў, нам людзі патрэбны, і чым больш іх, тым лепш — хор тады лепей глядзіцца... Таму ты, калі ласка, прыходзь і стой, але не спявай. Ну, хіба шэптам.

Я згадзіўся і спачатку строга выконваў гэтае «ўказанне»: проста стаяў, пад музыку варушыў губамі і так удзельнічаў у рэпетыцыях, нават у канцэртах. Потым пасмялеў — стаў ціхенька падпяваць. І гэта мне з рук сыходзіла... Але аднойчы, падчас выступлення, калі хор прыцішыў гучанне, мяне «прарвала», як той казаў, і я заспяваў так шчыра, так пранікнёна і так гучна, што пасля канцэрта мяне адразу ж «папрасілі» — больш сюды не прыходзіць. Думаеце, пасля гэтага я здаўся і кінуў спяваць? Не. У Маскве жыў дзядзька маёй жонкі. Чалавек ён дужа гасцінны, а таму, бываючы ў сталіцы, я часцяком заходзіў да яго. І, помню, згледзеў, што на шафе ў дзядзькавай спальні стаіць баян, побач з ім — ляжыць бубен. Я кажу:

— Дзядзька Валодзя, навучыце мяне іграць... Ну хоць на бубне.

Той, бачу, з ахвотаю падае мне бубен, знімае зверху баян і пачынае іграць кракавяк. Я з усёй сілы стараюся — адбіваю рытм. І як па мне, дык гучыць наш дуэт проста класна! Але баяніст чамусьці крывіцца, згортвае мяхі і ківае галавой: маўляў, дрэнь нашы справы.

— Можа, я б'ю не туды? — пытаюся ў дзядзькі. — Дык павучыце, скажыце, куды трэба, як?

Замест гэтага дзядзька цяжка ўздыхае:

— Ведаеш, Коля, музыку мала любіць, яе разумець яшчэ трэба...

Так адышла ў нябыт мая «блакітная» мара: ні спеваком, ні бубначом я не стаў, але не засмучаюся. У мяне — багатая фанатэка. Я з асалодай слухаю свае любімыя мелодыі, а часам і падпяваю. Праўда, так, каб ніхто не чуў.

Мікалай С.

г. Гомель.

ЛЕШЧ, ШТО ГУЛЯЕ САМ ПА САБЕ

Раніца ў Сцяпана пачыналася рана:

— Уставай, чуеш? На рыбалку паедзеш ці не? Сам жа ўчора прасіў, каб паднялі...

Сцяпан чуў і не чуў. Вострымі абцугамі сціскала галаву, у роце перасохла, язык не варочаўся...

— Ну, як сабе хочаш, — махнуў рукою бацька. — Я «Запарожца» завёў, зараз карове вады занясу і паеду. А ты...

— І я паеду... Пачакай, — не сваім голасам прасіпеў сын і споўз з канапы.

Учора і сапраўды яны дамаўляліся з бацькам паехаць на рыбалку на Макшанскае возера (Антось Канцавы там, казалі, вялізных лінёў надоечы вывудзіў). Але ж пасля гэтай дамовы, як на грэх, спаткаў знаёмца: у таго ў сталіцы ўнук нарадзіўся. Трэба ж было замачыць. Ну, яны і замачылі...

Як дадому дайшоў, Сцяпан не памятаў. Адзін свой чаравік знайшоў у сенцах. Шапка валялася ля студні — падняў...

У кухні, прыклаўшыся да трохлітровіка з расолам, кінуў у кішэню старой вятроўкі жменю кіславатых яблыкаў, узяў вуду, якая заўжды вісела пад страхой, прыкорм, з цяжкасцю ўлез ў пярэднюю дзверцу «Запарожца». Той, бедны, ад цяжару закрактаў, потым чмыхнуў, але ж з месца неяк скрануўся, паехаў.

Факт, што недзе праз гадзіну яны спыніліся, бацька няспешна выклаў на бераг усё неабходнае, распарадзіўся:

— Я на Антосева месца, да дубоў падскочу, а ты, сын, у гэтую вымоіну паспрабуй закінуць.

Пярэчыць сілы не было. Сцяпан падышоў да берага, як не сваімі рукамі, начапіў на кручок самага тлустага чарвяка, кінуў у ваду — заблізка атрымалася, але перакідваць зусім не хацелася. Ён сеў на калодку, утаропіўся ў паплавок, хоць той ні з месца — і хвіліну, і другую, і трэцюю...

У іншы раз Сцяпан, вядома ж, «не тупіў» бы: праверыў бы нажыўку, закінуў у другое месца. Аднак сёння... Сёння ён не зважаў ні на што, нават на дождж...

А ён — гусценькі, дробны — тым часам пайшоў. Нібы скрозь сон Сцёпа чуў яго шум, чуў, як побач... плюхнула вада. Расплюшчыў вока: паплавок і не думаў варушыцца. Праўда, у возеры, насупраць «Запарожца», як быццам нешта бліснула?

Ён насцярожыўся — прадраў абодва вокі. Так і ёсць: па паверхні вады гуляе... лешч, кіль на 10, уласнай персонай!

Сцёпа зажмурыўся, працёр кулакамі вочы, ушчыпнуў сябе за шыю — нічога падобнага: рыба не знікае! Нават больш за тое (сон у Сцёпкі як рукою зняло!): без ніякіх там сетак, паслухмяна «ідзе» да берага, самахоць выскоквае з вады і, віхляючы хвастом, скача ў бок «Запарожца».

— Усё, гэта глюкі, — уголас прызнаў Сцяпан. — З п'янкай трэба завязваць.

На ватных нагах, ледзь устаўшы з калодкі, Сцяпан падаўся следам за рыбінай, але да расчыненых дзвярэй «Запарожца» не дайшоў. Метры за тры на ўсялякі выпадак стаў, падумаў: «А раптам лешч, што туды заскочыў, зараз выскачыць нейкім страшыдлам...»

Замест яго з машыны паказаўся... бацька.

— Што зрабілася, сын? — з рогатам спытаў ён.

Сцёпка, нічога не цямячы, моўчкі лыпаў вачыма.

А бацька тым часам, смеючыся, расказваў яму, што ля тых дубоў, на Антосевым месцы, ён не затрымаўся, бо злавіў хіба трохі падлешчыкаў, што адтуль вярнуўся да машыны, што ўбачыў, як Сцёпка, седзячы, спіць, а на дварэ пачынаецца дождж, таму вуду ён закінуў проста з «Запарожца» (балазе, той стаяў ля самай вады)...

Казаў яшчэ, што клюе цяпер добра. І ловіцца — таксама (лёску ў траве сын не згледзеў)...

— А што з выпіўкай надумаў завязаць, гэта, сынок, правільна, — пахваліў Сцёпку бацька. — Бо інакш не толькі «хадзячых» ляшчоў, але і белых коней пабачыш, павесялішся, як рыбка на кручку.

Віктар САБАЛЕЎСКІ,

г. Узда.

ДВА... А ТРЭЦІ НЕ ЛІШНІ!

Кажуць, у чалавека ёсць тры ўзросты: ён садзіць бульбу, ён не садзіць бульбу, і ён... садзіць бульбу.

Але ж гэта не пра нас, бо мы другі хлеб садзілі і, мусіць, будзем садзіць заўсёды. Бацькі ў нас жывуць у вёсцы. І ў іх там, нібы ў пана Быкоўскага, з «паўвалочкі» зямлі пад садам, з паўвалочкі пад збожжам, бульбай... Усё, дзякуй Богу, пакуль расце, бо нас, дзяцей, у бацькоў трое — сын і дзве дачкі. Мы амаль разам хадзілі ў школу, паступалі вучыцца, па чарзе прыводзілі ў сям'ю зяцёў і нявестку, нараджалі першынцаў. І потым — так атрымалася — «падкідвалі» іх сваім бацькам. Бо іншага выйсця проста не было: не хапала месцаў у дзіцячых садках, да таго ж брат з сям'ёй займаў дзесяціметровы пакойчык у інтэрнаце, а мы з сястрой, з мужамі і дзецьмі перабіваліся на здымных кватэрах. А таму нашы дзеці, як і мы, гадаваліся ў вёсцы.

...У тое лета малых там было трое. Найстарэйшы, Колька, збіраўся ў школу, яму ў жніўні спаўнялася сем, сярэдняму, Мішу, было пяць з паловай, самаму маленькаму, Косціку, — толькі тры. Яны як быццам браты між сабою (хоць і стрыечныя), але ж па характарах зусім непадобныя. На Кольку, напрыклад, гарэла ўсё — і скура, і адзенне: вельмі непаседлівы быў (ды і застаўся). Міша — ужо спакайнейшы крыху. А вось пра Косціка дзед з бабай маглі наогул забыцца, бо яму цацак даў альбо ля акна пасадзіў, і ўсё: ён будзе гуляць альбо разглядацца, уголас расказваць, якое сёння надвор'е, хто па вуліцы ідзе, чый кот на плот ускочыў, якая курыца кудахча...

Гэтыя яго «казанні» бабуля найбольш любіла, бо ведала ўсё, што на вуліцы робіцца, хоць сама ў той час нешта мыла альбо варыла: пакуль здароўе не пахіснулася, яна ў нас вялікай працаўніцай была. І малых да работы прывучала.

Дык вось Косціка ў той дзень яна пакінула ў хаце, а двум старэйшым дала па бутэльцы — загадала жукоў каларадскіх збіраць.

Тыя без вялікай ахвоты, вядома ж, але пайшлі. І нават трохі назбіралі. А далей што? Падушыць гэтую брыдоту ў градках ці ў дварэ — яны ўжо ведалі — нельга.

— Найлепей было б спаліць, — прызнаў Коля.

З гэтай думкай яны пайшлі ў гараж, узялі там «гаручкі» (рэшткі адпрацаванага машыннага масла, якое (згледзелі!) дзед трымаў у бляшанцы з-пад фарбы), ссыпалі ў яе жукоў. Там жа, у гаражы, паднялі нейкай паперы, адшукалі дзядулевы запалкі (ён, курэц, хаваў іх... на ўсялякі выпадак), вынеслі гэтую «бомбу» ў двор і падпалілі.

Што здзівіла абодвух (як потым расказвалі), яркага, чырвонага агню ў бляшанцы чамусьці не было, а вось дыму... Бабуля — скемілі хлопцы — можа ўбачыць. Ці знюхаць. А таму распаленую бляшанку хлопцы папросту зафутболілі ў... хлеў.

Страшна падумаць, што магло б быць далей, калі б на звычнае месца ля акна бабуля ў той дзень не пасадзіла Косціка, калі б сама, узяўшыся мыць адзежу, не пыталася ў яго, што ж там робіцца на вуліцы.

Малы паслухмяна расказваў ёй і пра сароку, што ў сад прыляцела, і пра сабаку, што з будкі вылез, і пра хлеў, з якога... дым паваліў.

Бабуля дзіцяці не паверыла, але ж галаву падняла.

...На шчасце, людзей у вёсцы тады было шмат, вады ў калодзежах таксама. Да таго ж дзядуля наш трымаў у гаражы не толькі запалкі — там электрарухавік яшчэ быў, для паліву градак.

Так што агню разгарэцца не далі — хлеў, можна сказаць, не пацярпеў. А вось двое ўнукаў на баранкі зарабілі.

Маглі б і болей атрымаць, калі б не трэці.

К. ГРОМАВА,

г. Мінск.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.
dounar@zviazda.by

■ На чужых памылках

«НЫРНУЦЬ НЕ ШТУКА. А ВОСЬ ВЫНЫРНУЦЬ...»

Не, нездарма ў народзе кажуць: «Не ведаючы броду, не сунься ў воду!»

Але ж многім хочацца.

Я вырас на берагах рэк. Купацца стаў яшчэ ў маленстве і, вядома ж, ныраў усюды, дзе была вада. Часам, здаралася, дакранаўся да дна далонямі, часам — тварам. Але ж гэта ніколькі не спыняла мяне, гэта хіба... набліжала да вялікай бяды.

У той чэрвеньскі дзень я таксама нырнуў і... стукнуўся галавой у дно рэчкі. Пашчасціла яшчэ — мяне выцягнулі, але траўмы ў шыйным і грудным аддзелах пазваночніка былі досыць цяжкімі. У выніку для таго, каб маё жыццё зламалася папалам, спатрэбілася драбяза: крыху легкадумнасці і адно імгненне...

Сёлета вельмі рана адкрыўся купальны сезон. Ад спякоты людзі ратуюцца ля рэчак і іншых вадаёмаў, купаюцца, ныраюць у халодную ваду. Некаторыя пасля гэтага маюць звычку «пагрэцца» алкагольнымі напоямі, і тады ўжо любая лужына становіцца морам — з усімі наступствамі. Вось і заплываюць, куды не трэба, вось і ныраюць.

І не дай Бог тады ўдарыцца галавой у дно, траўмаваць шыйны аддзел пазваночніка, пашкодзіць спінны мозг. Нырэц пасля гэтага не можа самастойна выбрацца на бераг — уся надзея на іншых, якія выцягнуць, пакладуць пацярпелага на любы цвёрды шчыт і вось так, у ляжачым стане, даставяць у бальніцу.

...Сярод нырцоў вялікі адсотак загінулых, нямала і такіх, як я — інвалідаў (а гэта, нагадаю, трагедыя не аднаго чалавека, а ўсёй сям'і).

Так што цяпер я цудоўна разумею, да чаго прыводзіць саманадзейнасць. І іншым хачу сказаць, што нырнуць не штука, штука — вынырнуць.

Валерый ВАСІЛЕЎСКІ,

г/п Глуск

■ Нельга забыць

ПОМНІЦЬ. КАБ ЖЫЦЬ

Супрацоўнікі нашай бібліятэкі не адзін год збіралі, занатоўвалі ўспаміны землякоў — сведак ваенных падзей. «Вайна вачыма салдата», «Акупацыя: знак бяды», «Выпрабаваныя агнём», «Дзяцінства ў полымі вайны», «У рабства ў Германію»... Гэтыя маналогі-споведзі, зліўшыся ў адно шматгалосае пракляцце вайне, надоечы ажылі — у бібліятэчным тэатры аднаго акцёра.

...Вось жанчына ўзгадвае, як суседскі хлопчык паклікаў яе, малую, рваць радыску, «бо заўтра ж будзе вайна», як яна паслухала яго і нарвала. А калі маці са здзіўленнем спытала, навошта, адказала: «Дык заўтра ж будзе вайна». І тады матуля (чаго раней ніколі не было) яе пабіла. А вайна праз некалькі дзён і сапраўды пачалася.

Вось іншая жанчына ўзгадвае, як упершыню ў жыцці збіралася быць дружкай на вяселлі, як чакала яго, як марыла абуць першыя ў жыцці чаравічкі...

Але напярэдадні з'явіліся немцы і паблізу вёскі расстралялі ўсіх маладых хлопцаў. Таго жаніха — таксама.

Вось споведзь вяскоўца, які летам хадзіў басанож, а зімой — у лапцях. Боты абуваць яго навучылі ў арміі. Там жа салдата даймалі вошы: толькі на другі год вайны з'явіўся выратавальны сродак — жоўтая смярдзючая паста, у якой сталі кіпяціць салдацкае адзенне.

Простых салдат здзіўлялі і трафейныя пайкі. На фоне нашых, вельмі сціплых, сапраўднай загадкай сталі нямецкія плаўленыя сыркі. Спачатку думалі, што гэта ўзрыўчатка, потым — што кавалкі мыла, пакуль самы смелы не адважыўся ўзяць на зуб... «Дык можна ж есці! Смачна!»

Наступны маналог перадаў адчуванні салдата, які адзін на адзін апынуўся перад нямецкім «тыграм». Адзінае, што яго ўратавала — «кішэнная артылерыя» — бутэлька з гаручай сумессю.

Пазнавальна гучаў і аповед вадзіцеля машыны з устаноўкай легендарнага мінамёта «Кацюша», які за 7-10 секундаў выпускаў 16 снарадаў вагой па 40 кг кожны, за што ворагі празвалі яго «Сталінскім арганам». Нямецкае камандаванне абяцала буйную ўзнагароду таму, хто захопіць хоць адну ўстаноўку. І каб гэтага не здарылася, на кожнай машыне была ўзрыўчатка...

Пранікнёна гучалі споведзі жанчын-франтавічак, якія ішлі па ваенных дарогах у трохпудовых, не па памеры, ботах. Уражвала вынаходлівасць дзяўчыны, якая, атрымаўшы непамерна вялікае абмундзіраванне, прыстасавала пад спадніцу... рэчавы мяшок: лямкі абрэзала, донца распарола, адзела...

У маналогах ажывалі і жахлівыя ўспаміны салдатак — ад першага забітага немца, ад ампутаваных рук і ног, якія ў палявым шпіталі складвалі ў звычайны таз, ад «манікюру» (у час кароткіх перадышак многія засыналі так, што не чулі нават таго, як пацукі абгрызалі ім скуру пальцаў вакол пазногцяў). Як яны ж, дзяўчаты, жанчыны, вучыліся спаць на ходу: ідучы, трымаліся за рукі і сярэдняя спала.

Аднак там, на фронце, салдаты, салдаткі рызыкавалі толькі сваім жыццём, а вось жыхары акупаваных тэрыторый жылі ў штодзённай трывозе і за сябе, і за сваіх родных. Бібліятэчным акцёрам была агучана споведзь жанчыны, якая з дзіцем хавалася ад бамбёжкі ў падвале разбуранага дома. На хвілю адхінуўшыся (выйшла па ваду), яна трапіла ў аблаву: ажно два бясконцыя дні немцы прымусілі капаць траншэі. Факт: калі яна з крывавай ранай на сэрцы і крывавымі мазалямі на руках прыбегла ў падвал, дачушка яе памерла...

З жахлівым адчаем гучалі маналогі матуль, у якіх дзеці прасілі есці, а даць не было чаго, як ім малыя ў палаючай хаце казалі: «Горача, мамка, горача...» І гэты крык тут жа абрываўся, бо на людзей абвальваўся дах.

Не менш тужлівыя аповеды і ў дзяцей вайны — у дзяўчынкі, якая адна (дакладней — з чатырма кацянятамі) засталася ў спаленай вёсцы, у хлопчыка, якога ледзь не загрызла нямецкая аўчарка, у сястрычак, якія прасілі матулю перавязаць іх ляльку, расстраляную немцамі...

...Аптымізмам веяла ад аповеду жанчыны, якая ў вызваленым Мінску, з букетам палявых кветак, у сукенцы з мешкавіны (замест гузікаў — фасоліны, абцягнутыя тканінай) хадзіла сустракаць салдацкія эшалоны з фронту.

Яна ж, гэтая жанчына, узгадала, што на 300-ы дзень вызвалення Мінска на рынку з'явілася чырвоная губная памада ў маленькіх цюбіках, падобных да гільз ад патронаў.

Беларусь страціла кожнага трэцяга жыхара, у Беразіно насельніцтва зменшылася ўдвая. А таму 3 ліпеня, дзень вызвалення краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, гэта, вядома ж, свята, але свята са слязамі на вачах.

У жніўні-верасні ваенны тэатр маналога «Мая вайна» прадоўжыць свае выязныя «гастролі» ў працоўныя калектывы.

Тамара КРУТАЛЕВІЧ,
загадчыца аддзела маркетынгу раённай бібліятэкі,

г. Беразіно

ДЛЯ ЗВАРОТАЎ ZVAROT@ZVYAZDA.MINSK.BY

■ Ведай нашых!

РАЗУМНІК З ГРОДНА

Выпускнік Гродзенскай гарадской гімназіі Мікіта Валковіч можа без уступных іспытаў стаць студэнтам Маскоўскага дзяржаўнага інстытута міжнародных зносін.

Гэтае права хлопец заслужыў дзякуючы перамозе ў расійскім інтэлектуальным шоу для школьнікаў «Разумнікі і разумніцы». Шлях да фінальнай гульні быў няпростым. Спачатку Мікіта датэрмінова выйграў на жоўтай дарожцы ў чвэрцьфінале, а ў паўфінале перамог на чырвонай. У фінале ён дакладна адказаў на пытанні, чаму жанчыны любілі Чэхава і над якім творам незадоўга да смерці працаваў Астроўскі, і трапіў у лік дванаццаці пераможцаў.

Мікіта Валковіч — не першы выхаванец Гродзенскай гарадской гімназіі, які ўдзельнічаў у тэлепраекце «Разумнікі і разумніцы». Пачатак паклаў Станіслаў Сабалеўскі, цяпер — вядомы вучоны, доктар фізіка-матэматычных навук. У 21-гадовым узросце ён абараніў кандыдацкую дысертацыю, а ў 30 гадоў — доктарскую.

Дарэчы, разумнікаў і разумніц можна ўбачыць не толькі ў перадачах аднайменнага тэлепраекта. 27 выпускнікоў сярэдніх навучальных устаноў, якія сёлета праходзілі цэнтралізаванае тэсціраванне на Гродзеншчыне, атрымалі 100 балаў па адным з прадметаў. Дзесяць чалавек — па рускай мове, пяць — па матэматыцы, чатыры — па англійскай, тры — па беларускай мове, два — па грамадазнаўстве, хіміі і адзін — па фізіцы.

Напрыклад, Уладзіслаў Канецкі (Вялікабераставіцкая СШ) паказаў выдатны вынік не толькі па англійскай мове (100 балаў), але і рускай (96), а таксама па матэматыцы (89). Прычым, паводле слоў хлопца, паслугі рэпетытараў яму не спатрэбіліся, рыхтаваўся сам.

Барыс ПРАКОПЧЫК.
prakopchik@zviazda.by

■ Захапленні

У КОНЕЙ «ВЫРАСТАЛІ КРЫЛЫ»

На Аршаншчыне сотні людзей сталі сведкамі захапляльнага спартыўнага мерапрыемства

Тут адбыліся рэспубліканскія дзіцячыя спаборніцтвы па конным спорце. Дарэчы, горад Барань — адзінае месца ў Беларусі, дзе праводзяцца падобныя турніры. І, што дзіўна, не ў Віцебску, а менавіта тут размяшчаецца «штаб-кватэра» абласнога цэнтра алімпійскага рэзерву па конным спорце. А філіялы — у Оршы, Талачыне і Віцебску.

— Сёння праводзіцца «Кубак С. П. Закатава» па канкуры (пераадоленне перашкод. — **А.П.**). Сяргей Пятровіч Закатаў, былы дырэктар завода «Чырвоны кастрычнік». На жаль, год таму пайшоў з жыцця. Дзякуючы яму, у Барані пабудавалі першую канюшню, набылі спартыўных коней. Было гэта ў 1990 годзе, у няпросты час... Пасля разбурэння СССР ён, нягледзячы на фінансавыя цяжкасці прадпрыемства, працягваў рабіць усё магчымае для таго, каб конны спорт развіваўся ў глыбінцы...

Спаборніцтвы рэспубліканскага ўзроўню ў Барані праводзяцца другі год запар. У іх бяруць удзел хлопчыкі і дзяўчынкі ва ўзросце да 14 гадоў. Па-за конкурснай праграмай выступаюць і ўжо вопытныя наезнікі. Апошнія робяць гэта, каб у чарговы раз праверыць узровень сваёй падрыхтоўкі, каб конь не «страчваў форму», — распавядае «Звяздзе» **Ларыса САМАТОХІНА, старшыня Віцебскага абласнога цэнтра алімпійскага рэзерву па конным спорце і конегадоўлі.**

Пакуль дзеці рыхтаваліся да выступлення, пагутарыў са знакамітым спартсменам.

— Я па-ранейшаму выступаю і паралельна трэнірую. І прызавыя месцы займаў на этапах Кубка свету, спаборніцтвах рознага класа... А жонка Ірына брала ўдзел у Алімпіядах: у 2004 і 2008 гадах. У выездцы заняла 23-е месца — у Афінах, 29-е — у Ганконгу. Нядрэнны вынік для Беларусі, бо за «золата» змагаліся каля 60 спартсменаў... Наконт узросту ўдзельнікаў, наш спорт — адзін з нямногіх, у якім можна выступаць, нават калі табе за 60. У прыватнасці 68-гадовы японец змагаўся за медалі на Алімпіядзе ў Ганконгу. А самаму сталаму беларусу, калі не памыляюся, ужо пад 50. Усё залежыць ад таго, наколькі можаш, як кажуць прафесіяналы, «захоўваць сябе ў спорце», — адказвае на пытанні **Аляксандр ЛІС, майстар спорту міжнароднага класа.**

«Роўнага поля, стойкіх перашкод і душэўных коней!» — традыцыйна такім чынам жадаюць поспехаў наезнікам.

Падчас спаборніцтваў гледачы ўбачылі захапляльнае відовішча. Перыядычна здавалася, што ў коней літаральна «вырасталі крылы». Настолькі спрытна яны перескоквалі перашкоды. Вышыня апошніх да 110 сантыметраў, а на Алімпійскіх гульнях — да 160. А мянушкі якія цудоўныя ў жывёл: Лірыка, Барбарыс, Плакат, Гільза, Перамога, Хлопчык, Заліў...

Цікава, што каманднае месца вызначаецца з улікам найлепшых вынікаў двух спартсменаў. «Золата» атрымала каманда з Мінска. Перамогу прынеслі Ганна Голдышава, якая выступала на Эйнары, Ксенія Шэпелева — на Бэці. А ў індывідуальным заліку 1-е месца заняла прадстаўніца Магілёўшчыны Ксенія Лапіцкая (паказала клас на Энігме. — **Аўт.**)...

Фота Віктара НІКАДАЕВА.
Падчас спаборніцтваў.

У наступным годзе тут плануюць правесці міжнародныя спаборніцтвы.

— А наколькі ў маленькім гарадку дзеці цікавяцца конным спортам?

— Ім дзятва займаецца ахвотна. Нават з Оршы прыязджаюць на трэніроўкі. Толькі, на жаль, мала хлопчыкаў. Рост і вага для дзяцей, якія жадаюць стаць прафесійнымі спартсменамі, няважныя. Галоўнае, на мой погляд, каб любілі жывёл. Вучоба бясплатная. Дзеці ва ўзросце ад 10 да 12 гадоў — нашы выхаванцы першага года навучання. Потым, калі здаюць адпаведны нарматыў, вучацца далей. На сёння ў нас больш за 110 вучняў. Спартыўных коней каля 50, а ўсяго — больш за 70, — кажа **Наталля СІЛЬЧАНКА, намеснік дырэктара па асноўнай дзейнасці Віцебскага абласнога цэнтра алімпійскага рэзерву па конным спорце і конегадоўлі.**

Суразмоўцы падкрэслілі, што вельмі спрыяў развіццю спорту адпаведны ўказ Прэзідэнта, які быў падпісаны некалькі гадоў таму. Згодна з ім, у кожнай вобласці павінны былі стварыць аналагічныя цэнтры. У будучыню трэнеры і выкладчыкі глядзяць з аптымізмам. Рыхтуюць спартсменаў да ўдзелу ў найбліжэйшых чэмпіянатах Еўропы, «з прыцэлам» на Алімпіяду.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
pukshanski@zviazda.by

Аршанскі раён — Віцебск.

■ Супраць наркотыкаў

ТРОЕ СУТАК — І «НАВІНКА» ЗАБАРОНЕНА

Структура наркарынку зноў пачала мяняцца: калі летась курыльныя сумесі займалі звыш 70 працэнтаў, то цяпер — каля 50. У выніку актыўнага процістаяння сумесям пачалі вяртацца традыцыйныя опій і марыхуана.

За пяць месяцаў гэтага года выяўлена звыш 3 тысяч нарказлачынстваў. Усё часцей у іх уцягваюцца няпоўнагадовыя (асабліва калі размова ідзе пра цяжкія і асабліва цяжкія злачынствы). Па-ранейшаму ў гэтым бізнесе найбольшую актыўнасць праяўляюць тыя, хто нідзе не вучыцца і не працуе.

Спынена сёлета дзейнасць 4 наркалабараторый, перакрыты 16 міжнародных каналаў транзіту наркотыкаў, выяўлена 15 памяшканняў, прыстасаваных для вырошчвання наркараслін. Канфіскаваны 2 т некурыльнага тытунёвага вырабу «насвай».

Спецпадраздзяленне інтэрнэт-разведкі спыніла крымінальную актыўнасць 45 інтэрнэт-крам і 15 адпаведных сайтаў. Працягваецца работа ў дачыненні да яшчэ 103 віртуальных магазінаў, якія працуюць на 9 сайтах.

Паводле слоў **начальніка галоўнага ўпраўлення па наркакантролі і процідзеянні гандлю людзьмі Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь Васіля ЛОСІЧА,** новых наркотыкаў будзе з'яўляцца на айчынным рынку ўсё менш, паколькі любая навінка ў нашай краіне цягам усяго трох сутак трапляе ў пералік забароненых. У сувязі з цяжкай эканамічнай сітуацыяй у Расіі чакаецца магчымае ажыўленне так званага «паўночнага маршруту», але «ўнутраныя органы цалкам гатовы працаваць па перакрыцці транзіту афганскіх наркотыкаў праз краіны былога СССР у Еўропу».

У найбліжэйшы час праваахоўныя органы мяркуюць праводзіць ацэнку работы выканаўчай і распарадчай улады. У праекце дакумента, які прадугледжвае такі маніторынг, узгадваюцца колькасць смяротных выпадкаў, звязаных з наркаспажываннем, перадазіроўкі, занятасць тых, хто нідзе не працуе і не вучыцца, выпадкі зняцця з наркалагічнага ўліку і інш.

Калі ў 2005 годзе на ўліку было звыш 6 тысяч чалавек з дыягназам наркаманія, то сёння — амаль 10 тысяч. На прафілактычным уліку, калі яшчэ няма залежнасці, знаходзяцца каля 5 тысяч чалавек.

Летась выяўлена больш за 1700 новых пацыентаў з наркаманіяй, пастаўлены на прафілактычны ўлік звыш 3 тысяч, загінулі 257 нарказалежных.

Рост курыльных сумесяў заявіў аб сабе ў 2013-м. Так, яшчэ ў 2012 годзе на наркалагічныя ўстановы Мінска, Гомеля і Гродна прыпадаў усяго адзін зарэгістраваны спажывец такіх сумесяў. У 2013-м гэта былі ўжо 82 чалавекі.

Ва ўсіх рэгіёнах хворым на наркаманію даступна і амбулаторная наркалагічная дапамога, і медыцынская стацыянарная рэабілітацыя. Псіхасацыяльнай рэабілітацыяй займаюцца грамадскія і рэлігійныя арганізацыі, з якімі дзяржустановы, як правіла, падтрымліваюць цесныя сувязі.

Летась выяўлена больш за 1700 новых пацыентаў з наркаманіяй, пастаўлены на прафілактычны ўлік звыш 3 тысяч, загінулі 257 нарказалежных.

Як адзначае **кіраўнік рэспубліканскага цэнтра маніторынгу і прэвенталогіі РНПЦ псіхічнага здароўя Аляксей КРАЛЬКО**, спецыялізаваная дапамога аказваецца ў наркалагічных дыспансерах. Этап дэтаксікацыі доўжыцца каля 2 тыдняў. Пры згодзе пацыента можа праводзіцца стацыянарная рэабілітацыя — да 2 месяцаў (з удзелам урача-псіхіятра-нарколага, урача-псіхатэрапеўта, медыцынскага псіхолага), пасля чаго патрабуецца псіха-сацыяльная рэабілітацыя, якой займаюцца грамадскія арганізацыі. Найбольшую папулярнасць тут маюць групы ананімных наркаманаў. Заўважана, што пасля праходжання ўсіх гэтых этапаў гадавую рэмісію маюць да 40 працэнтаў нарказалежных.

Для прафілактыкі распаўсюджвання ВІЧ-інфекцыі і гепатытаў у краіне актыўна рэалізуюцца так званыя праграмы зніжэння шкоды — замяшчальная тэрапія, абмен шпрыцаў, распаўсюджванне прэзерватываў, аўтрыч-работа, сацыяльнае суправаджэнне, вакцынацыя ад вірусу гепатыту В, псіхалагічная дапамога і інш. Частка пунктаў абмену шпрыцаў размяшчаецца на базе дзяржаўных устаноў.

Дарэчы, **спецыяльны пасланнік генеральнага сакратара ААН па ВІЧ/СНІД ва Усходняй Еўропе і Цэнтральнай Азіі Мішэль КАЗАЧКІН**, які наведаў кабінет замяшчальнай тэрапіі на базе Мінскага абласнога клінічнага цэнтра «Псіхіятрыя-наркалогія», высока ацаніў яго работу пасля размовы з пацыентамі. Адна з беларускіх пацыентак паведаміла аб тым, што раней магла думаць толькі, дзе знайсці наркотык, а цяпер шмат часу праводзіць з дачкой: «Нядаўна былі з ёй у парку, сёння ідзём у госці на дзень нараджэння маёй сяброўкі. Я сама прыйшла ў праграму... Вельмі стамілася і зразумела, што больш не магу. Такое адчуванне, што раней я існавала, а цяпер пачынаю жыць». Яшчэ адзін удзельнік праграмы сказаў: «Нашы былыя сябры пераканаты, што яны свабодныя, а мы не, таму што павінны кожны дзень хадзіць сюды. Але я бачу, што гэта яны несвабодныя. І калі ім удаецца трапіць у праграму, як нам, яны кажуць зусім іншае».

Праграма замяшчальнай тэрапіі ў Беларусі стартавала ў 2007 годзе, калі ў межах праекта ПРААН на сродкі гранта Глабальнага фонду ў Гомелі адкрыўся першы кабінет. Дапамогу па праграме атрымліваюць каля тысячы чалавек.

Святлана БАРЫСЕНКА.
protas@zviazda.by

ДЛЯ ЗВАРОТАЎ ZVAROT@ZVYAZDA.MINSK.BY